Глядзіце ў аб'ектыў

Юозас Будрайціс прывёз на кінафестываль «Лістапад» свае фотаздымкі

Народны артыст Літвы Юозас Будрайціс, горача любімы ўсімі за ролі ў вядомых савецкіх фільмах, прэзентаваў у кінатэатры «Цэнтральны» сваю фотавыставу «Маё кіно. 1970—1990-я гг.» у рамках 20-га юбілейнага кінафестывалю «Лістапад» пры падтрымцы Пасольства Літвы ў Беларусі і Пасольства Беларусі ў Літве. На экспазіцыі прадстаўлены фотаздымкі, зробленыя Будрайцісам падчас здымак фільмаў «Гэта салодкае слова — свабода!» (1973), «З табой і без цябе» (1973), «Садута-тута» (1975), «Падранкі» (1976) ды іншых.

Юозас Будрайціс фатаграфуе наведнікаў сваёй выставы ў Мінску. 73-гадовы акцёр цудоўна валодае навыкамі карыстання навамоднымі гаджэтамі.

На чорна-белых пранікнёных цёплых фотаздымках мы бачым выдатных людзей: акцёраў, рэжысёраў, іншых удзельнікаў здымачнага працэсу. Юозас Будрайціс захапіўся фатаграфіяй у пачатку 1960-х гадоў. А на працягу ўсіх 1970-х не выпускаў камеру з рук. Вядома, акцёр не мог не фатаграфаваць на здымачных пляцоўках фільмаў, на якіх працаваў. Так з'явіліся гэтыя і многія іншыя фотаздымкі, дакладную колькасць якіх не ведае нават сам Будрайціс. На яго фота мы бачым маладую Марыну Няёлаву, Алега і Расціслава Янкоўскіх (дарэчы сам Расціслаў Іванавіч прысутнічаў на выставе), Інакенція Смактуноўскага і нават жонку Юозаса Будрайціса Віту. Гэта партрэт буйным планам, поўны глыбіні, мудрасці і смутку. Наогул, усе здымкі, паказаныя на выставе, — гэта паглыбленне ў душу праз позірк, ракурс, праламленне святла.

— Я заўжды прасіў герояў сваіх фотаздымкаў глядзець у аб'ектыў, на мяне, — **распавядае Юозас Будрайціс.** — Таму што я не фатаграфаваў наўмысна для выставы ці нечага такога. Я фатаграфаваў для сябе, каб потым, калі буду вось такі старэнькі, як цяпер, глядзець на гэтых людзей, узгадваць, і каб яны глядзелі на мяне.

Ёсць на выставе і фота са здымачнай пляцоўкі беларускага фільма «Рудабельская рэспубліка» (1972) рэжысёра Мікалая Калініна. Гэта пейзаж, ціхі і спакойны, мінімалістычна-лаканічны, зроблены не ў самы разгар здымачнага працэсу, а напрыканцы працоўнага дня. Людзей няма ў кадры, толькі белыя плямы прадметаў інтэр'ера на фоне вечаровай прыроды.

З нашай краінай Юозаса Будрайціса звязвае, дарэчы, не толькі мінулае, але і сучаснасць. Нядаўна скончыліся здымкі фільма Аляксандры Бутар «Белыя Росы-2», у якім Юозас іграў адну з галоўных роляў.

— Я вельмі пасябраваў з вашымі акцёрамі, з усёй здымачнай камандай. З Віктарам Манаевым, — гаворыць Будрайціс. — Ён ужо нават прыязджаў да мяне ў госці ў Вільнюс. Мы гулялі па горадзе, я паказваў яму свае ўлюбёныя мясціны. Цяпер хачу як-небудзь прыехаць і да яго ў госці.

Цікава, што нават калі на фотаплёнку сёння ўжо амаль ніхто не здымае, а час аналагавай фатаграфіі даўно мінуў, Юозас усё роўна не расстаецца са сваім захапленнем. Ён выкладвае ў Фэйсбук свае новыя фотаздымкі, зробленыя лічбавай фотакамерай альбо пры дапамозе планшэта.

На адкрыцці сваёй выставы ў Мінску Будрайціс таксама актыўна фатаграфаваў. Зрэшты, як і яго актыўна фатаграфавалі таксама. Наогул, у акцёра, які сёлета, нагадаю, з'яўляецца сябрам журы асноўнага конкурсу іграва га кіно «Лістапада», вельмі шчыльны графік інтэрв'ю, тэлеэфіраў. І самае галоўнае — трэба паспяваць глядзець і абмяркоўваць з іншымі сябрамі журы конкурсныя фільмы.

Але ёсць падазрэнне, што гэта далёка не апошні візіт Юозаса Будрайціса ў Беларусь. Таму — што не паспелі гэтым разам, паспеем у наступны.

Выстава фотаздымкаў Юозаса Будрайціса працягнецца да 15 лістапада.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.
Фота аўтара.

■ Выставы

Горад маладога Танка

З вялікай цікавасцю прыняў запрашэнне на адкрыццё выставы «Максім Танк. Гартаючы жыцця свайго старонкі...» у Вільнюсе, у Доме-музеі сям'і Венцлавых. Максім Танк даўно вабіць мяне як беларускі і вельмі самабытны творца. Як літовец, не магу застацца абыякавым, калі чытаю яго радкі пра Літву, пра мой родны Вільнюс. Яны поўныя пяшчотных, цёплых пачуццяў, хоць яго жыццё ў акупаванай палякамі Вільні не было лёгкім. Але малады таленавіты хлопец здолеў стварацъ і надгаладзь, і пры назойлівым паліцэйскім нагляд зе, і апынуўшыся за кратамі Лукішскай турмы...

Пісаць пра Танка лёгка. У літоўскай прэсе я ўжо апублікаваў каля дзесяці артыкулаў пра гэтага вялікага чалавека і паэта, але далёка не вычарпаў тэму. Такое ўражанне, што толькі крышку чарпануў з глыбокага калодзежа яго творчасці. Вось чаму з хваляваннем ішоў у Дом-музей сям'і Венцлавых. Спадзяваўся ўбачыць і даведацца штосьці новае пра Максіма Танка, таму што выставу ў Вільнюс прывёз Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры пры садзейнічанні Пасольства Беларусі ў Літве. І не памыліўся.

«Для гэтай выставы мы выбралі Дом Венцлавых не проста так, — сказала на адкрыцці **дырэктар Дома-музея сям'і Венцлавых Лайма ЖУКАЎСКАЙТЭ**. — Тут доўга жыў вядомы літоўскі паэт Антанас Венцлава, які блізка сябраваў з Максімам Танкам. Яны ў гэтым доме сустракаліся. Антанас Венцлава пераклаў на літоўскую мову шмат вершаў свайго сябра. Яго пераклады ёсць і ў двух вялікіх зборніках паэзіі Танка, выдадзеных у Вільнюсе на літоўскай мове, — «След маланкі» (1961) і «Глыток вады» (1986)».

Вядомая грамадская дзяячка Літвы, **мастачка Гражына ДРЭМАЙТЭ** ўспомніла сваё юнацтва, калі ў дом яе бацькі, мастака Уладаса Дрэмы, прыходзіў яшчэ малады Максім Танк, літоўскія паэты Ёнас Кекштас, Албінас Жукаўскас, Она Міцютэ і іншыя. Яны гаварылі пра паэзію, спрачаліся пра будучыню, дапамагалі адно аднаму. Усе гэтыя літоўскія паэты перакладалі вершы Танка, а ён — іхнія.

Шмат цікавага распавялі і пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын, і дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Лідзія Макарэвіч, і беларускі пісьменнік Анатоль Бутэвіч.

Ды і сама выстава «Максім Танк. Гартаючы жыцця свайго старонкі...» зноў і зноў вяртае вялікага беларуса гораду яго маладосці, умацоўвае літоўска-беларускія літаратурныя сувязі...

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,
уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.

г. Вільнюс

■ Да ведама

ПЕРАНОС АДАБ'ЕЦЦА НА ТРАНСПАРТНЫМ ГРАФІКУ

У сувязі з пераносам для шэрагу буйных сталічных прамысловых прадпрыемстваў працоўнага дня з 8 лістапада на суботу 2 лістапада, у гэтую пятніцу ў раскладзе руху гарадскога пасажырскага транспарту будуць змяненні.

Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», праца аўтобусных маршрутаў №№84, 88С будзе арганізавана па графіку «працоўнай» суботы. Аўтобусныя маршруты №№2С, 27 будуць перавозіць пасажыраў па графіку выхаднога дня. Праца аўтобуснага маршрута №27Д і тралейбуснага №41Д у гэты дзень адмяняецца. Дарэчы, праца прыгарадных маршрутаў бліжэйшым часам будзе арганізавана наступным чынам: 6 і 8 лістапада — па графіку пятніцы, 9 лістапада — па графіку суботы, а 7 і 10 лістапада — нядзелі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Асоба

З РОДУ ТАЛЕНАВІТЫХ

Днямі спаўняецца 75 гадоў з дня нараджэння доктара гістарычных навук, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Івана Сачанкі.

Прафесар Іван Сачанка — жывая легенда журфака БДУ. Пераважная частка яго свядомага жыцця прысвечана падрыхтоўцы кадраў беларускай журналістыкі. Яго выхаванцы плённа працуюць амаль ва ўсіх друкаваных і электронных СМІ нашай краіны і далёка за яе межамі.

Не першы год побач з Іванам Сачанкам працуе доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры замежнай журналістыкі і літаратуры Таццяна Дасаева. Ёй слова.

— Іван Іванавіч Сачанка — прадстаўнік таленавітага роду. Дастаткова ўзгадаць яго роднага брата — пісьменніка Барыса Сачанку, творчасць якога ведаюць не толькі на Беларусі, але і за яе межамі.

Яго жыццёвы шлях у значнай ступені паўтарае лёс многіх нашых суайчыннікаў, якія нарадзіліся напярэдадні Другой сусветнай вайны. Ён — дзіця вайны, а калі казаць больш дакладна, малалетні вязень фашызму. У гады Вялікай Айчыннай вайны фашысцкія акупанты вывезлі сям'ю Сачанкаў у Германію. З чэрвеня 1942-га па студзень 1945 года ён знаходзіўся ў канцэнтрацыйным лагеры Дахау.

Толькі моцны чалавек пасля жорсткіх выпрабаванняў у самым пачатку жыцця мае сілы не зламацца, не спыніцца ў сваім развіцці, рушыць далей. Пасля вяртання з Дахау на радзіму Іван Сачанка скончыў сярэднюю школу, адслужыў, як і належыць, у арміі. У 1960 годзе паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ, пэўны час сумяшчаў вучобу з работай адказнага сакратара газеты «Беларускі ўніверсітэт». У 1968 годзе паступіў у аспірантуру, а ўжо ў 1971-м датэрмінова абараніў кандыдацкую дысертацыю і быў залічаны выкладчыкам кафедры гісторыі журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ. Яго доктарская дысертацыя, якую ён абараніў у 1982 годзе, прысвечана аналізу праблематыкі фашызму і частковаму адраджэнню яго ідэалогіі ў дзеяннях сучасных неанацыстаў у Еўропе.

Асабліва ярка педагагічны і навуковы талент Івана Сачанкі праявіўся ў час яго кіраўніцтва кафедрай замежнай журналістыкі і літаратуры, створанай па яго ініцыятыве ў 1984 годзе. Яна, дарэчы, у наступным годзе адзначыць свой юбілей. Іван Іванавіч узначальваў кафедру да 2003 года і стаяў ля вытокаў стварэння айчыннай школы журналістаў-міжнароднікаў.

Таццяна Дасаева заўважае, што прафесар Сачанка — аўтар вялікай колькасці навуковых манаграфій, брашур, артыкулаў, вучэбных дапаможнікаў. Выключная яго роля ў падрыхтоўцы кадраў найвышэйшай кваліфікацыі: пад кіраўніцтвам прафесара абаронена 17 кандыдацкіх дысертацый, 15 з іх — грамадзянамі замежных дзяржаў. Ён чытаў лекцыі студэнтам Сафійскага ўніверсітэта, Свабоднага нямецкага ўніверсітэта, Кёльнскага каледжа камунікацый і інш.

Калегі прафесара Сачанкі адзначаюць яго надзейнасць і настойлівасць, уменне ставіць мэты і дасягаць іх. А яшчэ звычайна дадаюць, што ён вялікі жыццялюб і аптыміст.

Сёння ў сувязі з юбілеем Іван Іванавіч прымае віншаванні ад вучняў і калег не толькі БДУ. Да іх далучаецца і рэдакцыя «Звязды». Мы зычым яму моцнага здароўя, новых навуковых здабыткаў, светлых і радасных дзён на многія гады.

Леанід ТУГАРЫН

Даты | Падзеі | Людзі

1814 год — у невялікім бельгійскім гарадку Дзінан нарадзіўся Адольф Сакс — вынаходнік саксафона. Яго бацька, Шарль Жазэф, быў вядомым майстрам духавых інструментаў, самавукам. Музычныя здольнасці і цікавасць да канструявання перадаліся дзецям майстра, і больш за ўсё — старэйшаму з адзінаццаці дзяцей, Адольфу. Ён удасканаліў амаль усе вядомыя чалавецтву духавыя інструменты і нават стварыў цэлую групу інструментаў для ваенных духавых аркестраў — «саксгорны». Сусветную вядомасць яму прынесла вынаходніцтва саксафона. Адольф Сакс узяў кларнет, замяніў дрэва металам, прыстасаваў больш зручны муштук і змяніў сячэнне. Ён таксама забяспечыў новы інструмент больш прагрэсіўнай габойнай і флейтавай аплікатурай. Патэнт на саксафон быў атрыманы ім 17 мая 1846 года. Вядучыя кампазітары Францыі, куды неўзабаве пераехаў майстар, захоплена адгукнуліся аб новым інструменце. Аднак неўзабаве Сакс стаў ахвярай нядобрасумленнай канкурэнцыі. Іншыя майстры музычных інструментаў неаднаразова падавалі на яго ў суд, абвінавачваючы ў плагіяце (яны імкнуліся даказаць, што Сакс нібыта скраў у іх свае вынаходкі). У выніку судовыя выдаткі разарылі Сакса, а яго фірма па вытворчасці музычных інструментаў збанкрутавала. Ён памёр у беднасці на 80-м годзе жыцця і быў пахаваны на могілках Манмарта. А праз 15 гадоў у Новым Арлеане нарадзіўся джаз, які ўжо немагчыма ўявіць без вынаходкі Адольфа Сакса.

1832 год — нарадзіўся Міхаіл Аляксеевіч Дзмітрыеў, беларускі этнограф, фальклярыст, педагог. З 1853 года быў настаўнікам дваранскага вучылішча, пазней дырэктарам гімназіі ў Навагрудку. У 1867—1873 гадах — інспектар, затым дырэктар Гродзенскай дырэкцыі народных вучылішчаў. Член Рускага геаграфічнага таварыства. Займаўся збіраннем беларускай вусна-паэтычнай творчасці, асабліва тапанімічных і міфалагічных легендаў, якія публікаваў у газетах «Виленский вестник», «Минские губернские ведомости», часопісах «Вестник Западной России» і «Вестник императорского Русского географического общества». Апісаў народныя звычаі, сялянскі побыт, цікавіўся беларускай мовай. У архівах сабраў каштоўныя звесткі пра А. Міцкевіча, на радзіме паэта запісаў легенды і ўспаміны пра яго землякоў-сучаснікаў. Памёр у 1873 годзе.

1852 год — нарадзіўся рускі пісьменнік Дзмітрый Наркісавіч Мамін-Сібірак. Ён увайшоў у літаратуру серыяй так званых дарожных нарысаў «Ад Урала да Масквы». Першым яго буйным творам стаў раман «Прывалаўскія мільёны». Гэты твор на працягу года друкаваўся ў часопісе «Дело» і быў вельмі папулярным. Затым у часопісе «Отечественные записки» з'явіўся раман «Горнае гняздо», які замацаваў за Маміным-Сібіраком рэпутацыю выдатнага пісьменніка-рэаліста. У сваіх творах ён адлюстроўваў жыццё Урала і Сібіры ў паслярэформенныя гады, капіталізацыю краіны і звязаную з гэтым працэсам ломку грамадскай свядомасці, нормаў права і маралі. У 2002 годзе ў Расіі ў гонар пісьменніка заснавана прэмія яго імя, якую штогод уручаюць аўтарам твораў аб Урале.

Было сказана

Янка КУПАЛА, народны паэт Беларусі:

«Ачуняць, глянуць па-арлінаму смела, дружна на свет белы, загаманіць праўдай цэламу свету громка, свабодна мы зможам толькі тады, калі пад стрэхамі нашых хат зойме пачэснае месца наша родная беларуская кніжка. Праз памяць на магільныя насыпы і крыжы, пад якімі спяць нашыя дзяды і прадзяды, праз памяць на сваіх матак, каторыя нас ускармілі, — выракацца роднай мовы не маем права».



Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

ПРАВЕРЦЕ, ХАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па геаграфіі: Ракета. Аэрастат. Гурт. Соча. Аск. Бераг. Воцат. Горс. Арлі. Гал. Канал. Пудзіла. Таз. Акт. Тара. Шарк. Самара. Барыток. Ала. Бурка. Нора. Нерпа. Намаз. Кана. Ніжня. Кошт. Штурман. Аскепак.

Па гаворцы: Дальтанізм. Сан. Гадла. Шаля. Амар. Гітара. Плацёр. Арапка. Жабо. Арго. Лаза. Казка. Ухап. Арча. Іон. Адрас. Пчці. Кар. База. Ата. Віконт. Ажына. Цэнзар. Том. Карона. Вертальёт. Назоўнік.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.19	17.26	9.07
Віцебск	8.14	17.11	8.57
Магілёў	8.10	17.16	9.06
Гомель	8.01	17.18	9.17
Гродна	8.34	17.42	9.08
Брэст	8.29	17.48	9.19

Месяц

Маладзік 3 лістапада.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Апанаса, Івана, Мікалая, Пятра.*
К. *Хрысціны, Леанарда, Фелікса.*

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Двое сяброў.

— Вася, чуў, ты на выхадныя з жонкай адпачываць на базу адпачынку едзеш? Мая з вамі таксама едзе!

— Ага, едзем! Прыгледзець?

— Можаш не глядзець, але затрымай даўжэй!

Калі ўрачы вучыліся гэтак жа, як я, дык я, мабыць, лепш прыкладу трыпутнік.

— Тата, калі ўжо ты гэтыя санкі старадаўнія з лоджыі вынесеш?

— Гэта легендарныя санкі, дачушка. Я на іх цябе па раніцах у садок вазіў, а па вечарах мяне маці на іх з гаража прывозіла...

На экзамене па сапрамаце чуўся адчайны студэнцкі крык, які павольна і плаўна пераходзіў у салдацкі...

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 22.434. Індэкс 63850. Зак. № 4868.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 лістапада 2013 года.